# Мастацтва кнігі: на карысць краіны

Беларускія кнігавыдаўцы паспяхова завяршылі 2018 год: у конкурсе «Мастацтва кнігі» разглядалася 158 выданняў ад 40 арганізацый. Пасля адбору мастацка-экспертнай камісіі засталося крыху менш за палову кніг, якія ацэньвала журы пад старшынствам Міхаіла Баразны.

**Працяг тэмы на стар. 4** ►

# «Мастацтва кнігі»: на карысць краіны

Падвядзенне вынікаў нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», што адбываецца ў межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, сёлета праходзіла ў Палацы мастацтваў, дзе экспануецца выстаўка беларускіх графікаў (пра якую мы распавядзём у наступным нумары). Пераможцы былі вызначаны ў чатырнаццаці намінацыях.

Перш чым былі агучаны вынікі, намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі адзначыў, што кніга — найважнейшая каштоўнасць грамадства, якую трэба развіваць і прасоўваць ва ўмовах рэальнага часу, таму што кніга абрастае новымі задачамі. Яна павінна быць цікавая, запатрабаваная, карысная для грамадства, для асобнага чытача і для краіны. Менавіта таму патрабаванні да намінантаў былі вельмі высокія.

Найвышэйшая ўзнагарода ў намінацыі «Трыумф» прысуджана 4-томнаму выданню **«Вялікі гістарычны атлас Беларусі»** рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія» Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

У намінацыі «ЛІТ-фармат» ганаровы знак-сімвал «Залаты фаліянт» і дыплом пераможцы прысуджаны выдавецтву «Мастацкая літаратура» за кнігу Алеся Разанава **«Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж»**, а таксама дыплом першай ступені за кнігу **«Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: Сто паэтаў Кітая XX стагоддзя»**. Выдавецтва «Беларусь» адзначана дыпломам II ступені за выпуск кнігі Адама Міцкевіча **«Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве»**.

Кнігі для юных чытачоў прадстаўлены ў намінацыі «Разам з кнігай мы расцём», у якой пераможцам стала **«Залатая шарсцінка, срэбная павуцінка»** выдавецтва «Медыял». Дыпломы першай ступені прысуджаны выдавецтву Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра Мінска за кнігу **«Прыгоды сямейнага ката Гусарыка»** Таццяны Дашкевіч і выдавецтву «Альтыора Фортэ» за кнігу Мішэля Рэнэры **«Хто ёсць хто»**. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» ўзнагароджана дыпломам другой ступені за кнігу Валянціны Паліканінай **«Ні да чаго быць аднаму»**.

У намінацыю «Эўрыка» ўвайшлі навуковыя і навукова-папулярныя выданні. Найлепшай стала кніга **«У рытме гадоў, што ляцяць... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі»** выдавецкага дома «Звязда». Дыпломы першай ступені атрымалі навукова-папулярнае выданне **«Беларусь: шлях у космас»** і **«Беларусь — Літва: час збліжэння»** Уладзіміра Дражына (ТДА «Бялоагруп»).

Падчас віншавання пераможцаў намінацыі «Эўрыка» дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі адзначыў, што конкурс «Мастацтва кнігі» з кожным годам усё больш матывуе ўдзельнікаў на работу з сур'ёзнай літаратурай.

У намінацыі «Духоўнасць» дыплом пераможцы ўручылі выдавецкаму дому «Беларуская навука» за кнігу Вольгі Лабачэўскай **«Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы»**. Але адзначылі выданне **«Святло Полацкай зямлі: жыццё прападобнай Ефрасінні вачыма дзяцей»** (Спаса-Ефрасіннеўскі стаўрапігіяльны жаночы манастыр Полацка), а таксама кнігі **«Мы не можам жыць як усе. Протаіерэй Андрэй Лемяшонак»** і «Блізкія Богу і людзям» (Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр Мінска).

У намінацыі «Залатыя скрыжалі» ацэньваліся даведачныя і энцыклапедычныя выданні. «Залаты фаліянт» і дыплом пераможцы ўручылі выдавецтву «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» за падрыхтоўку і выданне трохтомнай энцыклапедыі **«Янка Купала»**. Дыплом першай ступені атрымала кніга-альбом **«Музеі Беларусі»** таго ж выдавецтва. Дыплом другой ступені прысуджаны выдавецтву «Беларусь» за кнігу Барыса Лазукі **«У засені замкаў і палацаў: матэрыяльная культура сацыяльнай эліты Беларусі XII — пачатку XX стагоддзя»**.

Пераможцамі і ўладальнікамі дыплома I ступені ў намінацыі «АРТ-кніга» сталі выданні Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: **«Веліч і слава Магілёўшчыны. Слава Беларусі і Расіі»** Ігара Марзалюка і альбом **«Шэдэўры карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка»**. Дыпломам II ступені ўзнагародзілі літаратурна-мастацкае выданне **«Удасканальвайся. Дасканаласць»** Паўла Семчанкі выдавецтва «Мастацкая літаратура» і альбом **«Васіль Шаранговіч»** выдавецтва «Беларусь».

— Новай традыцыяй, якую сфарміраваў конкурс «Мастацтва кнігі», з'яўляецца прадстаўленне ўнікальных выданняў, выраблены у адзінкавых асобніках з сапраўднымі афортамі, гравюрамі, з тэкстам, набраным уручную, — падкрэсліў падчас віншавання пераможцаў намінацыі «АРТ-кніга» старшыня журы Міхаіл Баразна. — Я на гэты працэс гляджу як на сапраўднае мастацтва, якое нельга не заўважаць. Тым больш яно яднае ў сабе як творчую, так і літаратурную частку. Ад гэтага каштоўнасць узрастае.

А ў намінацыі «Фотапогляд» перамогу атрымаў фотаальбом **«Беларусь. Пасланне міру»** (ТДА «Беловагруп»), дыпломамі адзначаны фотаальбомы **«Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Сады і паркі»** ў серыі «Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль» выдаўца Аляксандра Аляксеева і **«Бачу Беларусь такой.** ***I am seeing Belarus like that»*** Уладзіміра Цыдзіка (Выдавецкі дом «Звязда»), **«Імгненні стагоддзя. 1918—2018»** (УП «БелТА»).

Адна са спецыяльных намінацый конкурсу, што падвёў кніжныя вынікі Года малой радзімы, называлася «Сцяжынкамі роднага краю». Пераможцам вызначаны зборнік **«Зямля бацькоў, святая...»**, які выйшаў у серыі «100 вершаў» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Уладальнікамі дыпломаў сталі навукова-папулярныя выданні Артура Зельскага **«Хатынь. Трагедыя беларускага народа»**, Наталлі Яцкевіч і Міхаіла Нікіціна **«Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы»** («Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»), краязнаўчыя выданні **«Лошніца»** і **«Забашавічы»** (ТДА «Чатыры чвэрці»).

У персанальнай намінацыі «Майстэрства» адзначаюцца асобы. Найлепшым ілюстратарам кнігі прызнаны Вячаслаў Валынец за **«Казкі для гарэз»** (ААТ «Харвест»), лепшым фатографам — **Міхась Раманюк** за ўклад у беларускую нацыянальную мастацкую фотакультуру, лепшым дызайнерам стаў Міхал Анемпадыстаў за ідэю, аўтарскую канцэпцыю, тэкст і мастацка-графічнае выкананне выдання **«Колер Беларусі»**.

Ёсць за кім цягнуцца, ёсць дзеля чаго працаваць далей.

**Вікторыя АСКЕРА**

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**